# Дыялектыка традыцый нацыянальнай школы беларускай кінакрытыкі

## Да 100-годдзя прафесара Ефрасінні Бондаравай

УДК 791.072.3.036(476)



**Таццяна ПАДАЛЯК,**
**доктар філалагічных навук, дацэнт**

**Таццяна ПАДАЛЯК. Дыялектыка традыцый нацыянальнай школы беларускай кінакрытыкі.** Аналізуецца навуковая спадчына заслужанага дзеяча навукі Беларусі, доктара філалагічных навук, прафесара, аднаго з заснавальнікаў нацыянальнай школы беларускай кінакрытыкі Ефрасінні Бондаравай. Актуалізуюцца канцэптуальныя погляды даследчыцы на праблемы захавання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, развіцця традыцый беларускай кінакрытыкі на базе высокіх маральна-этычных прынцыпаў. Артыкул прымеркаваны да 100-годдзя навукоўцы.
**Ключавыя словы:** кінакрытыка, журналістыка, беларускі кінематограф, літаратура, нацыянальна-культурная ідэнтычнасць, каштоўнасныя арыенціры.

**Tatsiana PADALIAK. Dialectics of traditions of the national school of Belarusian film criticism.** The author looks into the scientific heritage of the Honored Scientist of Belarus, Doctor of Philology, Professor, founder of the National School of Belarusian Film Criticism Yefrosinia Bondareva. The author actualizes the scholar's conceptual views on the problems of preserving the national and cultural identity, developing the traditions of Belarusian film studies based on high moral and aesthetic principles. The article is dedicated to the 100th anniversary of the birth of the scholar.
**Keywords:** Film criticism, journalism, Belarusian cinema, literature, national and cultural identity, values.

## Імя, знакавае для Беларусі

Станаўленне беларускай кінакрытыкі ішло паралельна з развіццём нацыянальнага кінамастацтва. Імя прафесара Бондаравай нязменна атаясамліваецца са статусам заснавальніка гэтага параўнальна маладога навукова-творчага кірунку – беларуская кінакрытыка. Прафесар Міхаіл Цікоцкі невыпадкова называў Ефрасінню Леанідаўну жывым летапісам беларускага кінамастацтва.

Яшчэ студэнткай першага набору аддзялення журналістыкі БДУ, у 1948 годзе, яна трапіла ў кінематограф. Так атрымалася, што журналістыка і кіно ў жыцці Ефрасінні Бондаравай – дзве стыхіі, якія заўсёды ішлі побач і не толькі дапаўнялі адна адну, а і былі арганічна знітаваныя. Кіно давала кірунак Бондаравай-публіцысту, кінакрытыку і навукоўцу. Дыяпазон яе творчых інтарэсаў быў надзвычай шырокі і разнастайны. Яе навукова-даследчыя, кінакрытычныя, публіцыстычныя працы вызначаюцца грунтоўнасцю аналізу, глыбінёй, аргументаванасцю: кнігі, артыкулы, рэцэнзіі, творчыя партрэты – гэта адлюстраванне дыялектыкі фарміравання нацыянальнага кінамастацтва.

Ефрасіння Леанідаўна пакінула значную навуковую спадчыну. Яна з'яўляецца аўтарам 10 манаграфічных выданняў, у тым ліку «У кадры і за кадрам» (1973), «Час. Экран. Крытыка» (1975), «Кінастужка даўжынёй у жыццё: творчая біяграфія кінарэжысёра У.У. Корш-Сабліна» (1980), «Экран у розных вымярэннях» (1983), «Кінематограф і літаратура: творы беларускіх пісьменнікаў на экране» (1993), «Мастацтва і крытыка» (1999), «Ад сэрца – да сэрца: Старонкі жыцця і творчасці народнага артыста СССР і БССР кінарэжысёра Віктара Турава» (2001), іншых.

Навукоўца – кінакрытык – публіцыст – педагог. Унікальная асоба, якую вызначалі самабытны талент, неверагодная творчая энергія, кампетэнтнасць, бясспрэчны аўтарытэт у прафесійнай сферы, дакладна акрэсленая

Першыя журфакаўцы, 1945 год. Ефрасіння Бондарава – 3-я справа ў другім радзе



грамадзянская пазіцыя, высокія маральныя і эстэтычныя прынцыпы, уменне адстойваць свой пункт гледжання ў любых сітуацыях, рэдкі педагагічны талент, дар Настаўніка.

Напэўна, невыпадкова бацькі далі ёй імя, знакавае для Беларусі…

## Шлях у навуку

Ефрасіння Леанідаўна Бондарава нарадзілася 25 лістапада 1922 года ў вёсцы Гапонава Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці ў вялікай сялянскай сям'і. Яна згадвала: «Бацькі мае былі простымі людзьмі, сялянамі, і ўрокі іх у асноўным працоўныя: стаўленне да зямлі, да жыцця… Яны ніколі не гаварылі мне слоў пра сумленнасць, чалавечую годнасць. Казалі: не лянуйся, працуй, дапамагай. Сям'я ў нас была вялікая, шасцёра дзяцей. Чацвёра нарадзіліся яшчэ да імперыялістычнай вайны, а як бацька вярнуўся дадому, з'явіліся я і малодшы брат Вася. Ён


### ПРА АЎТАРА

ПАДАЛЯК Таццяна Уладзіміраўна.

Нарадзілася ў г. Мінску. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1986), аспірантуру (1992) і дактарантуру БДУ (2015).

Працавала ў раённым, шматтыражным друку, з верасня 1991 года – выкладчык, старшы выкладчык, з лютага 1999 года – дацэнт факультэта журналістыкі БДУ. У 1992–2009 і ў 2011–2012 гадах – у газеце «Звязда»: карэспандэнт, рэдактар аддзела культуры, намеснік галоўнага рэдактара. У 2009–2011 гадах – намеснік дырэктара па інфармацыйнай рабоце РУП «Дом прэсы», кіраўнік прэс-цэнтра. З 2015 года – дацэнт кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі (з 2019 года – кафедра медыялогіі), з 2020 года – прафесар кафедры медыялогіі факультэта журналістыкі БДУ.

Доктар філалагічных навук (2019), дацэнт (2004).

Аўтар амаль 150 навуковых работ, дзвюх манаграфій, двух вучэбна-метадычных дапаможнікаў, чатырох дакументальна-публіцыстычных кніг.

Сфера навуковых інтарэсаў: тэорыя і метадалогія журналістыкі, прафесійная этыка журналіста, уздзеянне прэсы на фарміраванне аксіялагічных прыярытэтаў аўдыторыі СМІ.

загінуў пад Віцебскам у Вялікую Айчынную. Узялі іх маладзенькіх, неабучаных – і адразу ў бой. Што яны маглі?.. Якія яшчэ бацькоўскія ўрокі? Не ўкрадзі, не вазьмі чужога – зрабі сваё. Маці гаварыла: вучыся добра, як Яша, старэйшы брат. Ён загінуў у блакаду, быў студэнтам інстытута кінаінжынераў у Ленінградзе – рыхтаваўся стаць гукаапературам кіно. Можа, таму ў мяне і абудзілася цікавасць да кінематографа».


Ефрасіння Бондарава ў маладосці. 1950-я гады

У 1940-м скончыла дзесяцігодку ў Лёзне. Брат Якаў ехаў у Ленінград працягваць вучобу, узяў з сабой і яе. Залічылі дзяўчыну без уступных экзаменаў – як выдатніцу – на гістарычны факультэт універсітэта. Прызнавалася, што пайшла на гістфак, бо толькі там іншагароднім давалі інтэрнат. Думала з наступнага года, 1941-га, вучыцца ў ленінградскім Інстытуце журналістыкі імя Вароўскага: добра пісала сачыненні, яшчэ школьніцай супрацоўнічала з раённым радыё. Планы перабіла вайна…

Здаўшы экзамены за першы семестр універсітэта, паехала ў Лёзна, уладкавалася піянерважатай, адначасова супрацоўнічала з раённай газетай «Ленінскі шлях». Частку заробленых грошай пасылала брату ў Ленінград, каб мог працягваць вучобу. Цяпер не ўсе ведаюць, што перад вайной была прынята пастанова аб платным навучанні ў ВНУ.

…Пасля вызвалення Лёзненскага раёна працавала ў райгазеце. Не хапала ні шрыфтоў, ні паперы, пазычалі ў воінскіх часцях. Але газету выпускалі – утраіх. Бондарава была і адказным сакратаром, і карэктарам, і літаратурным работнікам.

Па накіраванні райгазеты яе прынялі на журфак – нават без атэстата за сярэднюю школу. Потым ужо перадалі з Ленінграда ўсе дакументы, яны захоўваліся ў архіве. У адрозненні ад многіх студэнтаў, яна прыйшла вучыцца, ужо маючы вопыт работы ў рэдакцыі. Гэта была сталая асоба са сфарміраванымі поглядамі. У 1952 годзе скончыла аспірантуру, у 1953-м абараніла дысертацыю, стала кандыдатам філасофскіх навук. У 1948–1960 гадах працавала рэдактарам-кансультантам Міністэрства кінематаграфіі БССР, у 1951–1961 гадах – галоўным рэдактарам па вытворчасці фільмаў Міністэрства культуры БССР. З 1953 года выкладала ў БДУ – больш чым паўстагоддзя.

Доктарскую дысертацыю «Праблемы беларускага кінамастацтва і друк (адлюстраванне дыялектыкі часу ў вобразах герояў экрана і жанрах кінакрытыкі)» абараніла ў 1975 годзе. Адным з афіцыйных апанентаў быў член-карэспандэнт АН БССР, доктар філалагічных навук, прафесар І.Я. Навуменка.

Цікавы нюанс: у 10-томным зборы твораў народнага пісьменніка Беларусі акадэміка Івана Навуменкі, падрыхтаваным навукоўцамі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы НАН Беларусі пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта НАН Беларусі С.С. Лаўшука, змешчаны водзывы на дысертацыі, у тым ліку на працу Е. Бондаравай. Нягледзячы на тое што прайшло амаль паўстагоддзя, чытаецца гэты дакумент з вялікай цікавасцю. Як асобны твор. Погляд навукоўца і пісьменніка на даследаванне, названае ім глыбока кампетэнтным і прафесійным: «Працэс станаўлення беларускай кінакрытыкі – падчас складаны, супярэчлівы – даследчыцай прасочан гэтак жа грунтоўна, кваліфікавана, як і сам працэс пошукаў, здзяйсненняў, пралікаў і няўдач, які ідзе ў кінамастацтве» *[1, с. 481–482]*. Іван Якаўлевіч адзначыў, што «нашаму кіно не ў меншай меры, чым таленавітыя сцэнарысты, рэжысёры, акторы, патрэбны і свае тэарэтыкі, крытыкі, якія б сваім аўтарытэтным словам змагаліся супраць шэрасці, пасрэднасці, падтрымлівалі ўсё жывое, яркае, таленавітае» *[1, с. 477]*. Ён цалкам пагадзіўся з меркаваннем Е. Бондаравай, што менавіта ў драматургіі – «пачатак усіх поспехаў і недахопаў сучаснага беларускага кіно», што «мастацкі слабыя, недасканалыя сцэнары

прыводзяць да нежыццёвасці сітуацый, схематычнасці, бледнасці герояў у цэлым шэрагу кінафільмаў, бо ў іх знікае першаадкрыццё героя, якое складае сутнасць мастацкай творчасці» *[1, с. 479]*.

Дысертацыю Е. Бондаравай актыўна падтрымаў знакаміты рэжысёр, акадэмік, народны артыст СССР Сяргей Апалінарыевіч Герасімаў.

## Захаванне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці

Галоўным складнікам паняцця «нацыянальнае кіно» Е. Бондарава лічыла апору на беларускую літаратуру, нацыянальную акцёрскую школу. Кінематограф і літаратура, мастацкая якасць сцэнарыя, літаратурнай асновы – гэта праблематыка была ў цэнтры пастаяннай і пільнай увагі прафесара. Прынцыпы і формы трансфармацыі літаратурных вобразаў у кінематаграфічныя падрабязна прааналізаваны ў манаграфіі «Кінематограф і літаратура: творы беларускіх пісьменнікаў на экране» (1993). Увага засяроджана на экранізацыях твораў Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, І. Мележа, В. Быкава, І. Шамякіна, А. Адамовіча, У. Караткевіча, І. Чыгрынава і іншых вядомых беларускіх пісьменнікаў.

У кнізе змешчана фільмаграфія экранізацый твораў беларускай літаратуры (1926–1992). Лічба ўражвае: 72 кінастужкі – ад фільма «Лясная быль» рэжысёра Ю. Тарыча па аповесці М. Чарота «Свінапас» да дзевяцісерыйнага тэлевізійнага фільма «Плач перапёлкі» рэжысёра І. Дабралюбава па раманах І. Чыгрынава «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», «Свае і чужынцы». Пры гэтым даследчыца падкрэсліла, што з канца 1980-х гадоў змяніўся характар кінавытворчасці, тэматыка і жанрава-стылёвыя асаблівасці фільмаў: «Усё скранулася са звыклых месц – погляды на мінулую і сучасную рэчаіснасць, сацыяльныя канфлікты, герояў і матывы іх паводзін. Кінематограф пакаціўся па хутка пракладзенай сродкамі масавай інфармацыі каляіне адмаўлення ўсяго, што грунтавалася на прынцыпах, якія склаліся за савецкі перыяд. Хлынула «чорная хваля», стварыўшы пагрозу для кіно як сродку сцвярджэння духоўнага пачатку жыцця. І толькі кінастужкі, створаныя на аснове грунтоўных твораў літаратуры, аказаліся здольнымі ў нейкай меры супрацьстаяць негатыўным працэсам у кінематографе» *[2, с. 152]*.

Ефрасіння Бондарава і Таццяна Падаляк. 1992 год



Асаблівую ўвагу Е. Бондарава звяртала на дыялектыку традыцый, бесперспектыўнасць адрачэння ад вопыту мінулага. У яе заўсёды балела душа за беларускі кінематограф: «Самае ж галоўнае ў тым, каб на аснове нацыянальнай літаратуры ствараліся адметныя кінатворы… каб яны вызначаліся арыгінальнасцю і своеасаблівасцю аўтарскага мыслення, адметнасцю вобразаў, характараў. А пачатак гэтага – у мове, тым, што з'яўляецца душой кожнага народа» *[2, с. 162]*.

На мяжы стагоддзяў прафесар Бондарава адной з першых загаварыла аб тым, што мастацтва губляе арыенціры і, адмовіўшыся ад ранейшых прынцыпаў, набыўшы іншы змест, пачало ствараць аднавартасную прадукцыю. Тлумачыла: «Свабода вымагае культуры, маральнай і эстэтычнай адказнасці. Нічога гэтага няма ў большасці сучасных фільмаў. Кіно перад рэальнай пагрозай апынуцца за межамі мастацтва. Прынамсі, многія цяперашнія стужкі ўжо і не прэтэндуюць на мастацкасць».

Яна звяртала ўвагу яшчэ на адну праблему, што садзейнічала руйнаванню традыцый: «Арганізацыям, якія купляюць за мяжой фільмы, ставяцца ўмовы: прадаецца, напрыклад, „оптам“ 20 карцін, сярод іх 2–3 прыстойныя, за якія і плаціць пракатчык,

астатнія – дадаюцца абавязкова „ў нагрузку“. Гэта надзвычай небяспечная „нагрузка“. Напэўна, ёсць сілы, якім выгадна гаспадарыць на кінапрасторы былога СССР. У 1970-я гады Заходняя Еўропа перажыла наступ амерыканскага кінематографа. Але творчая інтэлігенцыя дамаглася ад уладаў сваіх краін квоты на паказ замежных фільмаў. У нас – наадварот: выкідаюць сваё, каб вызваліць месца для чужых».

Е. Бондараву непакоіла, што экран захліснула чарноцце, порна, гвалт, прыйшоў зусім іншы герой: калі раней ён быў часта ідэалізаваны, дык цяпер мусіць быць духоўна хваравітым. Многія творцы ў новай сітуацыі не навучыліся здымаць фільмы, якія б захаплялі, а не шакавалі. Часта згадвала, што рэжысёр Андрэй Таркоўскі справядліва лічыў кіно заняткам не столькі прафесійным, колькі маральным.

## Закон захавання энергіі

Журналістыка ўключана ў шырокае паняцце «культура» – гэты тэзіс для прафесара Бондаравай заўсёды быў вызначальным, у пэўным сэнсе нават аксіяматычным. За больш чым паўвека выкладчыцкай працы на журфаку БДУ яна здолела перадаць асэнсаванне гэтага дзясяткам, сотням сваіх вучняў. Прадметам даследавання і мастацтва, і журналістыкі з'яўляецца чалавек (у калейдаскопе жыццёвых складанасцей, у напружанасці духоўных шуканняў); сапраўднае мастацтва дакладна адлюстроўвае рэчаіснасць, уяўленні чалавека пра дабро і зло, высокае і нізкае, прыгожае і пачварнае…

Прафесар Бондарава выхавала цэлую плеяду выдатных беларускіх журналістаў, мастацтвазнаўцаў, дзеячаў кіно. Яна заўсёды гарой стаяла за сваіх вучняў. Падтрымлівала добрым словам, ад якога выраcталі крылы, падстаўляла плячо, працягвала руку ў складаных сітуацыях, дапамагала канкрэтнымі ўчынкамі.

Яе вучні працуюць і на кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі БДУ, якая была створана ў канцы 1990-х гадоў непасрэдна паводле ініцыятывы і дзякуючы вялікім намаганням прафесара Бондаравай. Загадчыкам кафедры, з часу заснавання, з'яўляецца адна з самых таленавітых яе вучаніц, кіназнаўца і кінакрытык, выдатны вучоны і педагог Людміла Саянкова-Мяльніцкая.

«Памяці Е.Л. Бондаравай – кінакрытыка, педагога, вучонага» – гэта прысвячэнне адкрывае грунтоўную манаграфію Л. Саянковай-Мяльніцкай «Беларуская кінакрытыка XX–XXI стст.: ад першых анонсаў у друку да гібрыдных жанраў у інтэрнэце», дзе дакладна і дасканала прааналізаваны гістарычныя аспекты фарміравання кінакрытыкі ў кантэксце журналістыкі, даследаваны каштоўнасна-культурныя даміканты ў прадстаўленні экраннага мастацтва, абагульнены вопыт беларускай кінакрытыкі як унікальнай формы пазнавальна-

**Ефрасіння Бондарава са студэнтамі. 1990-я гады**



**Ефрасіння Бондарава і Людміла Саянкова-Мяльніцкая з кінарэжысёрам Вадзімам Абдрашытавым. Канец 1990-х гадоў**



аналітычнай, мастацка-творчай і публіцыстычна-рэпрэзентатыўнай дзейнасці ў нацыянальным медыяасяроддзі. Аўтар справядліва адзначае: «Кінакрытыка, якая ўзнікла адначасова з кінематографам, стала той формай інтэрпрэтацыі, якая, па-першае, мінімізавала дыстанцыю паміж аўдыторыяй і новым відам відовішча, па-другое, узбагаціла кінематаграфічную практыку новымі ідэямі і сэнсамі, па-трэцяе, прыкметна паўплывала на развіццё і ўмацаванне культурнага статута журналістыкі. Кінакрытыку можна разглядаць як важны інструмент, які дапамагае ў пошуках сэнсавай і эстэтычнай уладкаванасці ў набіраючым моц «кінаброўнаўскім» руху» *[3, с. 3]*.




У манаграфіі даследуецца таксама шматгранная творчасць прафесара Бондаравай, аналізуюцца метадалагічныя падыходы, жанравыя асаблівасці, маральныя асновы, творчыя прынцыпы яе кінакрытычнай спадчыны. Аналізуецца і сучасны стан кінакрытыкі: «У цяперашні час кінакрытычная практыка прадугледжвае выяўленне і захаванне сэнсаў, інтэрпрэтацыю кінатвораў, аналіз кінапрацэсу ў фармаце не толькі друкаваным ці аўдыёвізуальным, але і ў віртуальным… Множнасць аўтарскіх стратэгій, сістэмнасць і сталасць публікацый на медыяплатформах, разнастайнасць напрамкаў для рэалізацыі прафесійных кампетэнцый забяспечваюць працэс развіцця кінакрытычнага дыскурсу ў Беларусі» *[3, с. 4]*.

У гэтым годзе Л. Саянкова-Мяльніцкая паспяхова абараніла доктарскую дысертацыю «Кінакрытыка ў беларускай журналістыцы: гісторыя, тэорыя, медыяпрактыкі» *[4]*. У яе таксама нямала таленавітых вучняў, якія спалучаюць навуковую і кінакрытычную дзейнасць. А значыць, школа прафесара Бондаравай пашыраецца і павялічваецца. Закон захавання энергіі: дыялектыка традыцый у дзеянні.

Ефрасіння Бондарава пайшла з жыцця ў чэрвені 2011 года. Ужо праз некалькі месяцаў, у лістападзе 2011-га, на факультэце журналістыкі была адкрыта студэнцкая аўдыторыя, названая ў яе гонар. У гэтым годзе выйшла кніга «Памяць і слава: Ефрасіння Леанідаўна Бондарава» ва ўніверсітэцкай серыі Memoria et Gloria, прысвечанай найбольш адметным вучоным Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта *[5]*. Выданне прымеркавана да 100-годдзя слыннага беларускага вучонага, педагога, кінакрытыка, кіназнаўцы: навуковая, кінакрытычная, публіцыстычная спадчына Е.Л. Бондаравай, успаміны яе калег, вучняў, родных. Пра тое, што было ў кадры і засталося за кадрам жыцця і творчасці даследчыцы.

***Фота з архіва кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі БДУ.***

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 18.10.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Навуменка, І.Я. Збор твораў: у 10 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларус. культуры, мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы; І.Я. Навуменка; падрыхт. тэкстаў, камент. і паслясл. Н. Пыско. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2012–2017. – Т. 10: П'еса, вершы, інтэрв'ю, анкеты, выступленні, водзывы на дысертацыі, некралогі, аўтабіяграфія, успаміны, дзённікавыя запісы, лісты 1944–2003. – 2017. – 989 с.
2. Бондарава, Е.Л. Кінематограф і літаратура: творы беларускіх пісьменнікаў на экране / Е.Л. Бондарава. – Мінск: Універсітэцкае, 1993. – 175 с.
3. Саенкова-Мельницкая, Л.П. Белорусская кинокритика XX–XXI вв.: от первых анонсов в печати до гибридных жанров в интернете / Л.П. Саенкова-Мельницкая. – Минск: БГУ, 2020. – 239 с.
4. Саенкова-Мельницкая, Л.П. Кинокритика в белорусской журналистике: история, теория, медиапрактики: автореф. дис. … доктора филол. наук: 10.01.10 / Л.П. Саенкова-Мельницкая; Белорусский государственный университет. – Минск, 2022. – 48 с.
5. Памяць і слава: Ефрасіння Леанідаўна Бондарава. Да 100-годдзя з дня нараджэння / склад. Л.П. Саянкова-Мяльніцкая [і інш.]; рэдкал.: В.М. Самусевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2022. – 280 с.